Н43
БИБЛИОТЕКА БГУ

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

7 сакавіка 2008 года, № 4 (1976)

ВЫСТАВЫ

## ЗААХВОЧВАЕМ АБІТУРЫЕНТАЎ

***Беларускі дзяржаўны універсітэт браў удзел у VI Міжнароднай спецыялізаванай выставе "Адукацыя і кар'ера", якая прайшла ў Мінскім гарадскім палацы моладзі з 28 лютага па 1 сакавіка.***

На стэндзе БДУ можна было даведацца пра ўсе факультэты і іншыя ўстановы адукацыі універсітэта, знайсці інфармацыю пра ўмовы паступлення і навучання. Наведвальнікі мелі магчымасць пазнаёміцца з вучэбна-метадычнай літаратурай, якая выдаецца ў Белдзяржуніверсітэце, а таксама набыць спецвыпуск газеты "Універсітэт" для абітурыентаў.

Усе тры дні на экспазіцыі працавалі прадстаўнікі факультэтаў, якія актыўна кансультавалі наведвальнікаў па пытаннях, што тычацца ўступнай кампаніі 2008 г. Варта сказаць, што на выставу прыйшлі не толькі выпускнікі школ гэтага года, але і вучні 9–10 класаў горада Мінска. Таму часта ўзнікала неабходнасць характарыстыкі для груп наведвальнікаў усяго спектра адукацыйных паслуг, што прапануе БДУ. Але рабіць гэта было зручна і прыемна, бо на гэты раз для кожнага факультэта былі падрыхтаваныя асобныя планшэты з інфармацыяй пра спецыяльнасці і сферы дзейнасці будучых спецыялістаў.

Сёлетняе мерапрыемства прайшло з вялікім размахам. На ім прэзентавалі свае адукацыйныя паслугі і прадукцыю 85 удзельнікаў, а колькасць наведвальнікаў налічвала каля 16 тыс. чалавек. Традыцыйнымі арганізатарамі выставы з'яўляюцца Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама і выставачнае прадпрыемства "Экспафорум".

**Віктар ПАЗНЯК,**
**начальнік аддзела ГУВНМР**

ФОТАФАКТ

## СМАЧНА ЕСЦІ!



*5 сакавіка ў вучэбным корпусе БДУ на Кальварыйскай, 9 першых наведвальнікаў прыняла ўтульная сталовая, разлічаная на 150 месцаў.*

**Фота Аляксандра СНАПКА**

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

**АД ЗВЫЧАЮ ПРАШЧУРАЎ ДА СУЧАСНЫХ ПРАВАВЫХ НОРМАЎ**
З нагоды святкавання 15 сакавіка Дня Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.
Стар. 2

**З ТЭХНАЛОГІЯМІ БДУ – У КОСМАС**
Пра стварэнне ў БДУ Цэнтра аэракасмічнай адукацыі распавядае яго дырэктар прафесар Уладзімір САЕЧНІКАЎ.
Стар. 3

**ХАЧУ ЖАНІЦЦА І... ВУЧЫЦЦА!**
Пра студэнцкія сем'і ў нашым універсітэце і падтрымку, якую ім аказвае альма-матэр.
Стар. 4

АДУКАЦЫЯ

## ДЗЯРЖАВА АПЯКУЕ ТАЛЕНАВІТЫХ



*Першы намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Жук.*

***Удасканаленню работы з адоранай моладдзю ў вышэйшых навучальных установах нашай краіны быў прысвечаны семінар, арганізаваны 27 лютага Міністэрствам адукацыі Беларусі на базе БДУ. У абмеркаванні ўдзельнічалі першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Жук, старшыня савета Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў Алена Бялова, прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, кіраўнікі сталічных і рэгіянальных ВНУ.***

У сваім дакладзе Аляксандр Жук падкрэсліў, што ў рэспубліцы створана і пастаянна развіваецца сістэма выяўлення, навучання, выхавання і сацыяльнай падтрымкі адоранай моладзі, суправаджэння яе кар'ернага росту. Прызёры рэспубліканскіх алімпіяд паступаюць у ВНУ краіны без іспытаў. Сёння ва універсітэтах арганізавана дыферэнцыяванае і індывідуальнае навучанне маладых талентаў у выглядзе спецкурсаў, курсаў па выбары, індывідуальных заняткаў, кансультацый і кураатарства вядомымі навукоўцамі. Акрамя таго, на практыцы рэалізуюцца новыя формы даследчай дзейнасці, да якой далучана больш за траціну студэнтаў дзённай формы навучання.

Па словах першага намесніка міністра адукацыі, пра вялікую цікавасць моладзі да навуковай сферы сведчыць тое, што на заключным этапе Рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ у 2007 г. удзельнічалі больш за 3 тыс. чалавек з 49-ці дзяржаўных і прыватных ВНУ. Таксама развіваецца дзейнасць студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый па прыярытэтных напрамках фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў. Дзеля гэтага распрацавана адпаведная нарматыўна-прававая база. У мінулым годзе ў рабоце СНДЛ удзельнічала больш за 5 тыс. студэнтаў, а Міністэрства адукацыі выдаткавала на падтрымку навукова-даследчых праектаў 548 млн руб. (у 2006 г. – 485 млн руб.).

Да таго ж, у краіне створаны электронны банк даных, які ўключае 1600 студэнцкіх навукова-даследчых распрацовак, здольных даць рэальны эканамічны эфект. Аляксандр Жук паведаміў, што неўзабаве ў новым корпусе БДУ на Кальварыйскай распачне работу пастаянная выстава навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў, дзе будуць дэманстравацца экспанаты па 11-ці тэматычных кірунках. Ён жа заклікаў прысутных кіраўнікоў ВНУ зрабіць унёсак у папаўненне згаданай экспазіцыі.

Акрамя таго, Міністэрства адукацыі распрацавала комплекс заходаў па павышэнні эфектыўнасці аспірантуры і дактарантуры. Гэтаму мусіць паспрыяць штогадовы конкурс грантаў для магістрантаў, аспірантаў і дактарантаў. У базе даных міністэрства маецца інфармацыя пра больш чым 4 тыс. маладых вучоных – выпускнікоў магістратуры, аспірантуры і дактарантуры са ступенню. Дарэчы, паводле ўказа кіраўніка дзяржавы летась 87 аспірантаў з 46-ці ВНУ і арганізацый атрымалі спецыяльныя стыпендыі ў памеры 775 тыс. руб.

Аляксандр Жук звярнуў увагу на тое, што лаўрэаты Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь маюць права на пазачарговае атрыманне льготных крэдытаў для будаўніцтва і куплі жылля. Сёння гэтай магчымасцю ўжо скарысталіся 24 чалавекі. Да таго ж, пры размеркаванні лаўрэаты таксама атрымаюць пазачарговае права на выбар месца працы. Першы намеснік міністра адукацыі нагадаў, што ў чэрвені мінулага года быў прыняты ўказ кіраўніка дзяржавы аб павышэнні на 15 % тарыфных ставак да акладу тых, хто ў свой час атрымаў узнагароду Спецыяльнага фонду Прэзідэнта. Акрамя таго, у рэспубліцы створаны банк даных адораных навучэнцаў і студэнтаў, куды ўключаны больш за 7 тыс. чалавек, з якіх больш за 3 тыс. студэнтаў, 120 магістрантаў і 328 аспірантаў.

На думку Аляксандра Жука, таленавітыя юнакі і дзяўчаты (выдатнікі, стыпендыяты) павінны фарміраваць і перспектыўны кадравы рэзерв саміх ВНУ. Зараз у гэтым спісе налічваецца 40 чалавек.

Дакладчык адзначыў, што ў цэлым праца з таленавітай моладдзю мае станоўчую дынаміку. Разам з тым, яе неабходна весці мэтанакіравана ўжо з дзіцячага садка. Першы намеснік міністра звярнуў увагу і на праблему якасных стратаў пры пераходзе ад аднаго ўзроўню адукацыі да другога. Школьнікі-пераможцы алімпіяд не заўсёды становяцца паспяховымі студэнтамі. Як мяркуе Аляксандр Жук, вучні, якія праявілі сябе ў школе, патрабуюць далейшых клапатлівых і ашчадных адносін. У ВНУ яны павінны апынуцца ў спрыяльным адукацыйным асяроддзі, дзе з першага курса іх адразу ж неабходна далучыць да сур'ёзнай навуковай працы. Намеснік міністра прапанаваў за кожным такім студэнтам на працягу ўсяго навучання замацаваць вядучага прафесара ці дацэнта.

У канцы свайго выступлення А.Жук заклікаў кіраўніцтва вышэйшых навучальных устаноў больш актыўна пераходзіць да арганізацыі праблемнага, практыка-арыентаванага навучання (курсавыя, дыпломныя, магістэрскія працы), звязанага з рашэннем канкрэтных задач рэальнага сектара эканомікі, і параіў наўпрост узаемадзейнічаць з магчымымі заказчыкамі.

**Падрыхтаваў**
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПАДАРУНКАМ да Дня жанчын стане прэмія ў памеры 150 тыс. руб., якую атрымаюць работніцы БДУ. Загад аб гэтым падпісаны рэктарам універсітэта Васілём Стражавым.

---

ДАМОВА аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Альденбургскім універсітэтам імя Карла фон Ассецкі падпісана ў Мінску. Тэрмін яе дзеяння – 2 гады. Ініцыятар падпісання пагаднення – прафесар славістыкі Альденбургскага універсітэта Герд Хенчэль. Прапановы нямецкага боку падтрыманы філолагамі і сацыёлагамі БДУ.

---

НАВУКОВА-АДУКАЦЫЙНАЕ супрацоўніцтва, у тым ліку арганізацыю ў БДУ магістэрскай праграмы па праектным менеджменце з атрыманнем беларускага і нямецкага дыпломаў, абмеркавалі 25 лютага ў Мінску прадстаўнікі нашага універсітэта і дэкан эканамічнага факультэта Вышэйшай школы г. Дортмунда прафесар Петэр Ройша.

---

ДЭЛЕГАЦЫЯ Лейпцыгскага універсітэта на чале з прафесарам Дытэрам Шульцам наведала БДУ з 18 па 22 лютага. Мэта візіту – падрыхтоўка III Беларуска-Германскага навуковага калёквіума. Госці пазнаёміліся таксама з дзейнасцю факультэтаў: філасофіі і сацыяльных навук, хімічнага, эканамічнага, гістарычнага і філалагічнага.

**Паводле інфармацыі**
**прэс-службы БДУ**

# АД ЗВЫЧАЮ ПРАШЧУРАЎ ДА СУЧАСНЫХ ПРАВАВЫХ НОРМАЎ

***Айчынныя канстытуцыйныя традыцыі сягаюць у глыбіню стагоддзяў. Сёлета спаўняецца 420 гадоў знакамітаму Статуту ВКЛ 1588 г. – найбольш "перадавому" ў тагачасным свеце. 15 сакавіка мы з годнасцю святкуем 14-ю гадавіну Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якая стала вянцом нацыянальных памкненняў нашага народа.***



Статут ВКЛ 1588 г.




Канстытуцыя БССР 1927 г.




Канстытуцыя БССР 1937 г.




Канстытуцыя БССР 1978 г.




Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

## ЗАРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСКАГА КАНСТЫТУЦЫЯНАЛІЗМУ

У старажытных беларускіх княствах (Полацкім, Турава-Пінскім, Віцебскім і інш.) асноўнай крыніцай права быў звычай. Аднак у дайшоўшых да нашага часу пісаных міжнародных дамовах ужо ўтрымліваліся нормы канстытуцыйнага значэння. Самыя важныя з іх гаварылі аб незалежнасці гэтых дзяржаў і прынцыпе роўнасці бакоў у міжнародных адносінах, водгукі чаго мы знаходзім у абласных граматах XV–XVI ст., дзе змяшчаліся нормы аб правах жыхароў пэўных зямель выбіраць ваяводу, мець уласную маёмасць і царкву, судзіцца сваімі судамі і інш. Канстытуцыйныя нормы ўтрымліваліся і ў іншых нарматыўных актах Вялікага княства Літоўскага, палітыка-эканамічным цэнтрам якога былі беларускія землі. Так, у грамаце Казіміра 1447 г. гаварылася аб суверэнітэце ВКЛ, свабодзе выязду за мяжу і інш. Грамата Аляксандра 1492 г. абмяжоўвала ўладу князя з боку рады, патрабавала прызначаць на пасады толькі ўраджэнцаў дзяржавы, замацоўвала нават прынцып мірнага суіснавання дзяржаў і інш.

Аднак найбольш поўна ў абагуленым выглядзе канстытуцыйныя нормы ўтрымліваліся ў статутах – сістэматызаваных законах XVI ст., напісаных на беларускай мове. У Статуце 1529 г., які складаўся з 13-ці раздзелаў і каля 300 артыкулаў (ад 244-х да 283-х), першыя тры раздзелы былі прысвечаныя ў асноўным нормам канстытуцыйнага характару. Статут замацаваў суверэнітэт і асновы грамадска-палітычнага ладу дзяржавы, правамоцтвы дзяржаўных і судовых органаў, нормы ўсіх галін тагачаснага феадальнага права. Важнымі былі палажэнні, якія абмяжоўвалі ўладу вялікага князя. Усе справы ў дзяржаве ён павінен быў вырашаць "дзеля агульнай карысці" са згоды паноў радных, абавязваўся захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы, не даваць пасад іншаземцам, прытрымлівацца законаў дзяржавы. У адным з артыкулаў гаварылася аб прынцыпе адзінства права: "Вси подданые нашим, так вбогие, якое и богатые, которого роду колве або стану были бы, ровно а одностайным писаным правом мають сужоны быти" (р. 1, арт. 12).

Статут 1566 г., які налічваў ужо 14 раздзелаў і 367 артыкулаў, канчаткова замацаваў заканадаўчую функцыю сойма, які яшчэ больш абмежаваў уладу манарха. Без згоды сойма князь не меў права пачынаць вайну, уводзіць новыя падаткі, прымаць нарматыўныя акты (р. 2, арт. 2). Закон абавязваў "всих людей ... заховати при свободах и вольностях" (р. 3, арт. 2).

Трэці Статут 1588 г. утрымліваў не толькі вялізны прававы матэрыял (488 артыкулаў), але і больш дасканалую юрыдычную тэрміналогію. У прадмове Леў Сапега, на сродкі якога быў надрукаваны Статут, з гонарам заяўляе: "... не обчым яким языком, але своим власным правы списаные маем и кождого часу, чого нам потреба ку отпору всякое кривды, ведати можем". Нягледзячы на Люблінскую унію і стварэнне Рэчы Паспалітай, Статут замацоўваў суверэнітэт Вялікага княства Літоўскага (р. 3, арт. 1). Увесь гэты акт пранізвала ідэя прававой дзяржавы, яскравым сведчаннем чаго было замацаванне прынцыпу падзелу ўлад.

У Статуце знайшла адлюстраванне тэндэнцыя фарміравання новай, буржуазнай правасвядомасці. У ім мы знаходзім шмат нормаў, якія сведчаць, што заканадаўцы імкнуліся ва ўсім прытрымлівацца прынцыпаў законнасці і справядлівасці, абараняць не толькі саслоўныя правы шляхты, але і асабістыя правы і інтарэсы кожнага свабоднага чалавека. Артыкулы Статута абавязвалі службовых асоб, а таксама і самога вялікага князя дзейнічаць у адпаведнасці з законам, абараняць інтарэсы дзяржавы і народа.

Статут быў адным з першых еўрапейскіх законаў, які ўсталёўваў нормы, накіраваныя на ахову прыроды, падтрыманне і павелічэнне яе рэсурсаў.

Палажэнні Статута 1588 г. атрымалі працяг у законах Рэчы Паспалітай, у тым ліку ў Канстытуцыі 1791 г.

Аб юрыдычнай значнасці Статута сведчыць тое, што ён дзейнічаў у якасці закону амаль да паловы XIX ст. і служыў узорам кадыфікацыі для іншых дзяржаў.

Наступным надзвычай супярэчлівым, працягам айчыннага канстытуцыяналізму стаў савецкі перыяд. Складанае, паэтапнае развіццё беларускай дзяржаўнасці адлюстравалася ў канстытуцыях БССР 1919, 1927, 1937, 1978 гадоў. Яны былі тыповымі для савецкага перыяду і характарызаваліся дэкларатыўнасцю і класавай накіраванасцю. Першая Канстытуцыя 1919 г. была прынятая ў выніку Маніфеста Часовага Рабоча-сялянскага ўрада ад 1 студзеня 1919 г. аб стварэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ). Характэрнай яе рысай было абвяшчэнне дыктатуры пралетарыяту. Акрамя таго, у ёй адсутнічалі палажэнні аб выбарчым праве, СНК, мясцовых органах улады, бюджэце рэспублікі і інш. Магчыма таму, што па указанні ЦК РКП(б) ужо 27 лютага 1919 г. Беларуская і Літоўская рэспублікі аб'ядналіся ў адзіную Літоўска-Беларускую ССР. Пасля яе распаду 31 ліпеня 1920 г. адбылося ўзнаўленне Беларускай ССР. У снежні 1920 г. прымаюцца Дапаўненні да Канстытуцыі 1919 г., паводле якіх ствараецца ўрад – СНК БССР.

У сувязі з утварэннем у 1922 г. СССР і прыняццем саюзнай Канстытуцыі, у 1927 г. прымаецца другая Канстытуцыя БССР. Яна замацавала факт уваходжання рэспублікі ў склад СССР і мела ўжо палажэнні аб сістэме цэнтральных і мясцовых органаў улады і кіравання, неўсеагульным шматступенчатым выбарчым праве, сталіцы – горадзе Мінску, чатырох дзяржаўных мовах (беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай, прычым з перавагай першай) і інш.

У адрозненне ад папярэдніх актаў, Канстытуцыя БССР 1937 г., прынятая ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР 1936 г., мела ўжо больш прагрэсіўныя палажэнні. Так, упершыню было замацавана ўсеагульнае, роўнае і прамое выбарчае права пры тайным галасаванні, з'явіліся новыя правы грамадзян (на працу, адпачынак, матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці і інш.), у сувязі "з ліквідацыяй у СССР эксплуататарскіх класаў" замацоўвалася новая назва органаў улады – "Саветы дэпутатаў працоўных" і інш. Вышэйшымі органамі ўлады сталі Вярхоўны Савет БССР і Прэзідыум. Аднак палажэнні Канстытуцыі, прынятай у перыяд сталінскіх рэпрэсій, разыходзіліся з рэчаіснасцю, мелі дэкларатыўны і прапагандысцкі характар. Акрамя таго, важнейшыя пытанні дзяржаўнага жыцця адносіліся да кампетэнцыі СССР. У Канстытуцыі пацвярджалася кіруючая роля Камуністычнай партыі ў жыцці грамадства, а асобы, якія замахваліся на грамадскую і сацыялістычную ўласнасць, абвяшчаліся ворагамі народа.

Канстытуцыя БССР 1978 г., прынятая на падставе Канстытуцыі СССР 1977 г. у сувязі з тым, што "ў СССР пабудаваны развіты сацыялізм", уключала некаторыя новыя палажэнні, напрыклад, уводзілася новая назва органаў улады – "Саветы народных дэпутатаў"; дадаваліся правы грамадзянам (права на жыллё і інш.). Аднак у яе Прэамбуле гаварылася, што быццам бы беларусы да Кастрычніцкай рэвалюцыі не мелі ўласнай дзяржаўнасці. Гэта несправядлівае палажэнне ліквідавала дзеючая Канстытуцыя РБ, у якой сцвярджаецца аб старажытным паходжанні беларускай дзяржаўнасці.

**Прафесар Таісія ДОЎНАР,**
**доктар юрыдычных навук**

## ДЗЕЮЧАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ – ЮРЫДЫЧНАЯ АСНОВА ДЛЯ ПАБУДОВЫ ПРАВАВОЙ ДЭМАКРАТЫЧНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Сёння ў Беларусі дзейнічае пятая па ліку Канстытуцыя. Яна прынцыпова адрозніваецца ад папярэдніх савецкіх асноўных законаў. У ёй агучана роўнасць усіх формаў уласнасці – дзяржаўнай і прыватнай (раней прыярытэт мела сацыялістычная форма ўласнасці). Скасавана манаполія адной палітычнай сілы (раней дамінавала камуністычная ідэалогія, выступленне супраць якой пагражала крымінальнай адказнасцю); чалавек стаў прызнавацца вышэйшай каштоўнасцю і мэтай дзяржавы (раней перавагу мелі калектыўныя, класавыя інтарэсы) – аднак гэта не значыць, што ўвага павінна надавацца інтарэсам толькі аднаго індывідуума, важна забяспечыць баланс інтарэсаў асобы, грамадства, дзяржавы. Новая Канстытуцыя як Асноўны Закон краіны (пра гэта напісана ў яе Прэамбуле), вызначае ўсю прававую піраміду. У дзяржаве вяршэнствуе Закон, Права, а не рашэнні якіх-небудзь грамадскіх (палітычных) арганізацый.

Найважнейшае дасягненне Канстытуцыі 1994 г. – замацаванне дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі. Па сутнасці, у ёй успрыняты і развіты з улікам сусветнага досведу асноўныя ідэі, якія змяшчаліся ў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце 1990 г.

Дзеючая Канстытуцыя абвясціла Беларусь прававой дэмакратычнай сацыяльнай дзяржавай. Ухваленне яе новай рэдакцыі народам у лістападзе 1996 г. дазволіла мірным шляхам вырашыць палітычны крызіс, і зараз мы развіваемся ва ўмовах эканамічнай, сацыяльнай і прававой стабільнасці. Гэта не значыць, што ўсё працякае гладка, што адсутнічаюць спрэчкі паміж рознымі сацыяльнымі слаямі. Яны існуюць. Галоўнае – вырашаць іх цывілізаваным спосабам. У гэтым запэўнівае нядаўні негатыўны досвед Венгрыі і Францыі, дзе моладзь пратэставала супраць беспрацоўя і ігнаравання іншых яе сацыяльных інтарэсаў.

Вызначальнай рысай Канстытуцыі з'яўляецца замацаванне ў ёй шырокага спектра правоў чалавека і грамадзяніна – асабістых, палітычных, сацыяльна-эканамічных і сацыяльна-культурных, што дазваляе нам у новых умовах развівацца як сацыяльнай дзяржаве. У такой дзяржаве ствараюцца ўмовы для рэалізацыі кожным чалавекам сваіх здольнасцяў, пры гэтым матэрыяльная дапамога з яе боку аказваецца толькі тым, хто па аб'ектыўных прычынах не ў стане забяспечыць сабе годны ўзровень існавання. У параўнанні з сярэдзінай 90-х гг. мінулага стагоддзя ў нас значна павялічылася заработная плата і памер пенсій, а ўзровень беспрацоўя паменшыўся да мінімуму (каля 1 %), да таго ж больш чым удвая павялічылася колькасць студэнтаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных устаноў. І гэта ўсё дзякуючы сацыяльнай палітыцы дзяржавы. Калі б яна праводзілася ў інтарэсах алігархічных кланаў, то магчымасці людзей, якія толькі распачынаюць дарослае жыццё, былі б зусім іншыя. Канешне, эканамічны дабрабыт нашых грамадзян, у тым ліку студэнтаў, яшчэ далёкі ад таго ўзроўню, які б задавальняў усіх – і саміх грамадзян, і дзяржаву. Таму кіраўніцтва краіны прыкладае ўсе намаганні для забеспячэння інтэнсіўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі.

Заслугай з'яўляецца тое, што нават пры адсутнасці багатых карысных выкапняў мы дынамічна развіваемся, дзяржаўная ўласнасць і прыродныя рэсурсы не расцягнуты ў выніку "дзікай" прыватызацыі і служаць людзям. У гэтых адносінах органы дзяржаўнай улады праводзяць народную палітыку, у адрозненне ад многіх замежных краін, у тым ліку і на постсавецкай прасторы, дзе назіраецца палярызацыя даходаў і падзел на бедных і багатых, што спараджае тысячы бяздомных і іншыя маргінальныя катэгорыі і правакуе сацыяльную напружанасць.

Канстытуцыя вызначыла сістэму актаў заканадаўства, органаў, якія іх прымаюць, і субардынацыю паміж імі. Прынцыповых адрозненняў ад замежнай практыкі тут няма. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Кіраўніком дзяржавы і закліканы забяспечыць узаемадзеянне прадстаўнічай (заканадаўчай), выканаўчай і судовай галін улады. Дарэчы, унесеныя рэферэндумам у 2004 г. карэктывы ў артыкул Канстытуцыі аб скасаванні абмежаванняў на колькасць выбранняў адной асобы Прэзідэнтам краіны таксама не з'яўляюцца выключэннем для еўрапейскай практыкі. Напрыклад, у Францыі, Канстытуцыя якой вельмі блізкая да беларускай, і ў Італіі такіх абмежаванняў няма.

Пасля ўхвалення паправак да Канстытуцыі на рэферэндуме 1996 г. урад атрымаў вялікі аб'ём паўнамоцтваў. Зараз Савет Міністраў – гэта цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання, які мае шырокія функцыі і права заканадаўчай ініцыятывы. Вартасцю Канстытуцыі і прынятага на яе аснове заканадаўства з'яўляецца стварэнне эфектыўнай сістэмы органаў мясцовага кіравання і самакіравання, у якой няма месца дубляванню і супрацьстаянню паміж рознымі галінамі ўлады. Сфарміравана кампактная сістэма органаў судовай улады, дзе кожная падсістэма выконвае свае задачы.

Варта ведаць, што вышэйшы ўзровень легітымнасці Канстытуцыя набывае, калі яе падтрымлівае большасць народа на рэферэндуме. У сусветнай практыцы, дарэчы, кожная шостая канстытуцыя прынята шляхам народнага галасавання. Асабліва важна атрымаць ухваленне народа на пераломе эпох, як гэта было ў канцы XX ст. у Расіі, Літве, Эстоніі, Румыніі і інш. У шэрагу еўрапейскіх дзяржаў нават праводзіўся рэферэндум адносна Еўрапейскай Канстытуцыі.

Канстытуцыя з'яўляецца актам, які інтэгруе ўсю прававую сістэму краіны – сістэму заканадаўства, дзяржаўных органаў, прававую ідэалогію, прававую свядомасць. Яна фіксуе не толькі дасягнуты ўзровень развіцця грамадства, але і памкненні ў будучыню. Яе патэнцыял аграмадны. Канстытуцыя ўсё больш і больш становіцца непасрэдна дзеючым дакументам.

**Прафесар Рыгор ВАСІЛЕВІЧ,**
**доктар юрыдычных навук**

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

# З ТЭХНАЛОГІЯМІ БДУ – У КОСМАС

***У БДУ на факультэце радыёфізікі і электронікі створаны Цэнтр аэракасмічнай адукацыі. Аб гэтым распавёў кіраўнік ЦАА, доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Уладзімір САЕЧНІКАЎ.***



*Інжынер кафедры фізікі ФРіЭ Сяргей Салаўёў зачараваны новымі перспектывамі.*

– Апошнім часам у Беларусі ствараецца касмічная сістэма дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Яна аб'яднае беларускія станцыі прыёму касмічнай інфармацыі і задаволіць патрэбы ўсіх арганізацый, зацікаўленых у атрыманні даных з космасу. З гэтай мэтай распрацоўваецца беларускі касмічны апарат з высокім распазнаваннем. Да моманту яго запуску павінны быць падрыхтаваныя кваліфікаваныя кадры для наземнага комплексу ўпраўлення і прыёму касмічных даных.

Яшчэ ў 2005 г. Міністэрства адукацыі Беларусі распрацавала палажэнне "Аб сістэме падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў для беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання", у якім былі вызначаныя асноўныя напрамкі работы. Як мяркуецца, надалей наш Цэнтр аэракасмічнай адукацыі стане каардынацыйным для ўсёй айчыннай касмічнай галіны, што фарміруецца зараз.

**– Як жа будзе арганізаваны і дзе засяродзіцца асноўны вучэбны працэс?**

– Цэнтр аб'яднае такія вядучыя ВНУ, як БДУ, БДУіР, БДТУ, БНТУ, а таксама Полацкі дзяржаўны універсітэт і некаторыя іншыя ўстановы. Увесці новую спецыяльнасць ці спецыялізацыю не так проста, як здаецца, і пачынаць рабіць трэба там, дзе для гэтага ёсць глеба, а менавіта, – вядзецца падрыхтоўка па сумежных спецыяльнасцях, якія можна крыху падкарэктаваць. Напрыклад, аптычнае і касмічнае прыладабудаванне зручней было б увесці ў БНТУ, што і зрабілі. Такім чынам узнікнуць аналагічныя спецыяльнасці і ў іншых вышэйшых навучальных установах. У ЦАА існуе каардынацыйны савет, куды ўваходзяць прарэктары адпаведных ВНУ, якім і даручана гэтая работа.

Увогуле, касмічныя даследаванні ў Беларусі праводзіліся яшчэ ў часы СССР, аднак яны мелі фрагментарны характар, паколькі беларускія вучоныя выконвалі толькі канкрэтныя замовы. Тым не менш, па некаторых кірунках у нас маюцца добрыя зачыны. Так, на факультэце радыёфізікі і электронікі БДУ прафесар Бяляеў распрацоўваў апаратуру для станцыі "Мір". Адначасова мы ладзілі абсталяванне для месяцаходаў. Тое ж можна сказаць і пра іншыя вучэбныя ўстановы. Напрыклад, у Інстытуце цепламасаабмену АН Беларусі засталася унікальная апаратура, якой не знойдзеш сёння ва ўсім СНД. Таму мы пачынаем не на голым месцы. Зараз дзеля стварэння айчыннай касмічнай галіны трэба толькі сістэматызаваць усю работу. А гэта пры цяперашнім развіцці тэхналогій і тэхнікі – рэч рэальная нават для невялікіх краін. Ранейшыя спадарожнікі былі буйных памераў і важылі тоны, і запусціць іх было пад сілу толькі звышдзяржавам, а сённяшнія спадарожнікі значна меншыя, больш спецыялізаваныя і больш эфектыўныя. Некаторыя з іх, так званыя нанаспадарожнікі, важаць да 100 г. і могуць быць выведзеныя на арбіту разам з іншым грузам. Такія праекты пад сілу нават асобным універсітэтам.

**– Значыць, і ЦАА ў перспектыве здолее распрацаваць гэткі касмічны апарат?**

– Маскоўскі дзяржаўны універсітэт ужо мае вопыт запуску ўласнага мікраспадарожніка. Сёлета плануе запусціць новы. Наша краіна падключаецца да адпаведных расійскіх праграм, каб дабраць пэўных ведаў. Мы таксама супрацоўнічаем з расійскімі калегамі. Па дамове з Цэнтрам кіравання МДУ, які сачыў за спадарожнікам "Таццяна" і будзе кіраваць новым апаратам, інфармацыю з апошняга плануецца перадаваць і на нашу станцыю. Ёсць надзея, што мы зможам атрымаць досвед у кіраванні гэтым спадарожнікам, а пазней падключымся і да тэхналогій вытворчасці элементаў самога спадарожніка. У будучым спадзяемся стварыць і ўласны касмічны апарат.

**– Якое тэхнічнае аснашчэнне і функцыі мае ЦАА зараз?**

– Станцыя прыёму даных аэракасмічнага зандзіравання Зямлі, якая нядаўна ўсталявана ў нашым Цэнтры аэракасмічнай адукацыі, – па сутнасці метэаралагічная. З дапамогай такой станцыі можна адсочваць узнікненне пажараў, навадненняў, рух цыклонаў, антыцыклонаў і даваць прагнозы надвор'я, што і робяць у Дзяржкамгідрамеце. Акрамя таго, яна можа выкарыстоўвацца ў якасці вучэбнай лабараторыі для студэнтаў. Першыя заняткі мы правялі ў тэставых групах з найлепшымі студэнтамі. Узровень падрыхтоўкі нашых навучэнцаў досыць высокі, каб засвоіць новыя веды. Надалей будуць прымацца слухачы і без спецыяльных ведаў, напрыклад, чыноўнікі з міністэрстваў, якіх трэба перападрыхтоўваць у першую чаргу. Двое нашых выкладчыкаў стажыраваліся ў аўтарызаваным цэнтры ў Маскве і валодаюць інфармацыяй па найбольш сучасных праграмных прадуктах. Некаторых лектараў мы можам запрашаць і з-за мяжы, што прадугледжана ў дамовах з вядучымі расійскімі касмічнымі цэнтрамі.

**Гутарыла Ганна ЛАГУН**

УШАНАВАННЕ

# ЗДАРОЎЕ ЖАНЧЫНЫ – ЗДАРОЎЕ НАЦЫІ

***Пад такой назвай 28 лютага прайшла акцыя Саюза жанчын і прафсаюзнай арганізацыі супрацоўнікаў універсітэта ў межах Дня здароўя БДУ.***

У гэтым мерапрыемстве ўдзельнічалі вядомыя лекары-спецыялісты: мамолаг прафесар Леанід Бутырскі, гастраэнтэролаг прафесар Іван Бранавец і гамеапат Таццяна Аляксеева. Карысную інфармацыю паведамлялі стэнды, падрыхтаваныя унітарным прадпрыемствам "Фітагор", РУП "Белмедпрэпараты" (па выпуску лекавых зёлак) і Цэнтрам медыцыны "Агнія", які прапагандуе методыкі ўзнаўлення прыгажосці і здароўя. Трэнажорныя тэхналогіі прадэманстравала кафедра біямеханікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта фізічнай культуры, а спецыялісты кафедры фізвыхавання БДУ пазнаёмілі з экспрэс-тэсціраваннем фізічнага стану чалавека.

# ПАМЯЦЬ ПРА НАСТАЎНІКА

***22 лютага ў дзень нараджэння вядомага вучонага і былога рэктара БДУ Антона Сеўчанкі на кафедры лазернай фізікі фізічнага факультэта быў наладжаны круглы стол з удзелам яго вучняў і паслядоўнікаў. Сёння яму б споўнілася 105 гадоў. Прысутныя ўзгадалі асноўныя даты жыцця і дзейнасці Антона Нічыпаравіча.***

У 1953 г. ён быў абраны акадэмікам і неўзабаве ўзначаліў Інстытут фізікі і матэматыкі АН БССР. Адначасова ў БДУ ствараецца кафедра фізічнай оптыкі пад яго кіраўніцтвам. У 1957 г. Антон Нічыпаравіч прызначаецца рэктарам БДУ, якім кіраваў на працягу 15-ці гадоў. У 1972 г. ён узначаліў створаны ім годам раней Навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем, які зараз носіць яго імя. За сваю самаадданую дзейнасць Антон Сеўчанка быў узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі і ганараваны званнем Героя Сацыялістычнай Працы.

Знакамітага вучонага вельмі шануюць на фізічным факультэце, дзе самая лепшая аўдыторыя носіць імя Антона Сеўчанкі.

Антон Нічыпаравіч стварыў вялікую навуковую школу, шмат яго вучняў выраслі да самастойных даследчыкаў, якія паспяхова развіваюць арыгінальныя навуковыя кірункі. Больш за 30 яго вучняў абаранілі кандыдацкія дысертацыі, а 9 – доктарскія. Прафесары Аляксандр Чарняўскі, Дзмітрый Умрэйка, Анатоль Камяк, Канстанцін Салаўёў, Яўген Варапай, дацэнт Іван Зяцькоў і іншыя паслядоўнікі штогод збіраюцца разам у дзень нараджэння свайго настаўніка. Сёлета на святкаванне круглай даты да іх завітаў і рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў, які вучыўся ў часы свайго выбітнага папярэдніка.

**Ганна ЛАГУН**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Алімпіяда для абітурыентаў і старшакласнікаў на механіка-матэматычным факультэце БДУ** – "Першы крок да здзяйснення мары" ("Звязда", 29.02).

**Навукова-практычная канферэнцыя "Першы крок у навуку"** – "Мехмат БДУ шукае будучых Ламаносавых" ("Звязда", 29.02); "Репетитор", № 2.

**Пераможцы "Супермэна"**– "«Супермэн» і да «Мельніцы моды» давядзе..." ("Звязда", 29.02).

**Меркаванне дырэктара Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ Давіда Ротмана пра стаўленне грамадства да партый** – "Партыйны выбар" ("Звязда", 29.02).

**Меркаванне рэктара БДУ прафесара Васіля Стражава пра тэсты для будучых абітурыентаў некаторых спецыяльнасцяў эканамічнага, правазнаўчага і журналісцкага профіляў, якія будуць папярэднічаць прыёмным іспытам у ВНУ** – "Прафадбор: эсэ плюс тэст на інтэлект?" ("Звязда", 28.02), "Беларускія абітурыенты будуць пісаць «прафесійныя» эсэ. Як у ЗША" (tut.by, 28.02); "Настоящий таможенник знает, почему небо синее" ("Народная газета", 28.02).

**Індыкатар, які вымярае стому** – вынаходніцтва прафесара кафедры грамадскага здароўя Валерыя Дзядзічкіна – БелТА (28.02).

**Факультэт журналістыкі ў новым будынку** – "Alma mater белорусской журналистики" ("7 дней", 28.02).

**Гутарка з загадчыкам лабараторыі НІІЯП БДУ прафесарам Віктарам Ціхаміравым** – "Атрымаць энергію чорнай дзіркі" ("Настаўніцкая газета", 28.02).

**Практыкум для будучых фізікаў-ядзершчыкаў распрацаваны на кафедры ядзернай фізікі БДУ** – "Фізікаў-ядзершчыкаў рыхтуюць мала, затое якасна" ("Настаўніцкая газета", 28.02).

**Праграма "Антыплагіят", распрацаваная вучонымі БДУ** – "Рэспубліка", tut.by (28.02).

**Акцыя "Здароўе жанчыны – здароўе нацыі" Саюза жанчын і прафкама БДУ** – БелТА (27.02); "Минск-новости" (28.02).

**Кірмаш вакансій на геафаку БДУ** – БелаПАН (27.02).

**Вучоныя БДУ плануюць пастаўляць універсальныя лазерныя хірургічныя апараты ў Іран і Паўднёвую Карэю** – БелТА (26.02).

**Гутарка з загадчыкам лабараторыі Рэспубліканскага цэнтра праблем чалавека БДУ Святланай Сагайдак** – "Впереди – килобайты дорог" ("Народная газета", 23.02).

**Меркаванне дэкана фізічнага факультэта Віктара Анішчыка пра падрыхтоўку спецыялістаў-ядзершчыкаў у БДУ** –"Кадровый ответ" ("Знамя юности", 22.02)

**Цэнтр перспектыўнага дзяцінства БДУ** – "Каб сям'я была шчаслівай" ("Беларусь", № 1).

**Мерапрыемствы да Дня абаронцаў Айчыны ў БДУ** – БелТА (21.02); "Минск-новости" (22.02).

**Падрыхтоўчыя заданні па матэматыцы і фізіцы ў Ліцэй БДУ** – "Репетитор", № 2.

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

АБ'ЯВА

**ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасадаў:**

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі эксперыментальнай фізікі высокіх энергій;

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі кампутарнага мадэлявання фізічнага эксперымента, лабараторыі моцнай электронікі.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб`явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, каб. 315; тэл. 226- 42-31.**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

***Міжнародны навуковы семінар па матэматыцы і механіцы для магістрантаў, аспірантаў і маладых супрацоўнікаў арганізаваў 25–27 лютага механіка-матэматычны факультэт БДУ на базе САК "Брыганціна".***

Ён прайшоў у форме лекцый і кансультацый вядучых навукоўцаў БДУ, Інстытута матэматыкі НАН Беларусі, а таксама літоўскіх гасцей з Інстытута матэматыкі і інфарматыкі (г. Вільнюс).

Мэта семінара – знаёмства маладых вучоных з сучаснымі кірункамі развіцця матэматыкі і механікі. На думку арганізатараў, яго актуальнасць звязана з тым, што матэматычныя даследаванні, якія праводзяцца ў рэспубліцы, часцяком з'яўляюцца вельмі раз'яднанымі. Дарэчы, семінар прымеркаваны да 50-годдзя з дня заснавання механіка-матэматычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта.

***

***На геаграфічным факультэце 27 лютага адбыўся "Кірмаш вакансій".***

Гэтае мерапрыемства праводзілася на факультэце ў другі раз з мэтай садзейнічання студэнтам у пошуках першага працоўнага месца, усталявання трывалых сувязяў і кантактаў з патэнцыйнымі работадаўцамі і іх азнаямлення з вучэбнымі планамі факультэта.

У кірмашы ўдзельнічалі прадстаўнікі Рэспубліканскага гідрамедцэнтра, інстытутаў меліярацыі, эканомікі, аграрнай эканомікі НАН Беларусі, Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў, Беларускага навуковага геолагаразведвальнага інстытута "БелНІГРД", навукова-даследчага геалагічнага унітарнага прадпрыемства "БелГЕА", Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства аэракасмічных метадаў у гэадэзіі "Белаэракосмагеадэзія", Рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў "Белгеалогія" і "Белгеадэзія", Міністэрства абароны, а таксама іншых ведамстваў і арганізацый.

***

***На геаграфічным факультэце 28 лютага прайшлі навуковыя чытанні, прамеркаваныя да 100-годдзя з дня нараджэння вядомага вучонага-географа Віктара Заўрыева.***

З прывітальным словам да ўдзельнікаў мерапрыемства звярнуўся дэкан геаграфічнага факультэта БДУ прафесар Іван Пірожнік. З дакладамі пра жыццё і дзейнасць В. Заўрыева, яго ролю ў гісторыі факультэта выступілі прафесары Вольга Якушка і Расціслаў Жмойдзяк. У чытаннях удзельнічалі таксама вучні і паслядоўнікі навукоўца, выкладчыкі і студэнты геаграфічнага факультэта.

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ХАЧУ ЖАНІЦЦА І... ВУЧЫЦЦА!

***Штогод павялічваецца колькасць дзяцей, заведзеных бацькамі ў студэнцкім узросце. Кіраўніцтва БДУ ўсяляк падтрымлівае маладыя сем'і. Напярэдадні Дня жанчын мы пацікавіліся, як гэта дапамога аказваецца і наколькі адчуваюць яе самі студэнты.***



*Сям'я Сушко: з трыма дзецьмі займальна і весела!*

### Парады ад спецыялістаў

Натуральна, што асабліва клапоціцца пра маладыя сем'і Саюз жанчын БДУ. Тут існуе клуб "Студэнцкая сям'я XXI стагоддзя", які ладзіць сустрэчы са спецыялістамі ў адпаведнасці з абранай для абмеркавання тэмай (у лістападзе быў запрошаны праваслаўны святар айцец Аляксандр, у размове з якім узнімаліся важныя маральныя праблемы). Тыя, хто мае дзетак, найперш зацікаўленыя ў парадах, як іх выгадаваць, а хто толькі рыхтуецца да павелічэння сям'і – у інфармацыі пра цяжарнасць і роды. Будучым маці распавядаюць, у якіх радзільных дамах і як лепей нараджаць, дзе прайсці трэнінгі, напрыклад, для сумесных родаў, могуць падказаць, да каго звяртацца па кансультацыю. На базе інтэрнатаў адбываюцца сустрэчы з гінеколагамі, мамолагамі, андролагамі і іншымі вузкімі спецыялістамі, гатовымі адказаць на самыя інтымныя пытанні.

Студэнцкая сям'я спецыфічная – бацькі мусяць і вучыцца, і дзесьці падзарабляць, і дзетак даглядаць. Такім бацькам складана – вельмі шмат амбіцыяў, бо, адчуваючы сябе дарослымі, хочуць разлічваць на ўласныя сілы. Неўзабаве пасля родаў маладая мама застаецца самнасам з раней не вядомымі праблемамі, муж зазвычай на вучобе ці на працы – не дзіўна, што дзяўчаты часта перажываюць пасляродавую дэпрэсію. "Студэнцкая сям'я XXI стагоддзя" – гэта не толькі добрая нагода вырвацца з дому, з аднастайнасці, але і магчымасць пазнаёміцца з "роднаснымі душамі", пачуць парады ад дасведчаных жанчын. Сем'і пачынаюць сябраваць, узаемадапамагаць. Падчас клубных сустрэч адбываюцца гульні і конкурсы (напрыклад, конкурс на найлепшы ліст цяжарнай да свайго будучага малыша), Псіхалагічная служба БДУ ладзіць анкетаванні і апытанні – усё мае на мэце змадэляваць пэўныя складаныя сітуацыі і загаддзя знайсці з іх выйсце. Таксама можна проста пабавіць час у прыемнай кампаніі, павесяліцца і атрымаць падарункі.

Наступная сустрэча сяброў клуба плануецца ў красавіку і будзе прысвечаная моладзевай культуры.

### Жыллё

Каб адбыцца як адзінаму цэламу, новаўтворанай сям'і важна вырашыць жыллёвае пытанне. Тут дапамагае Студгарадок, які апякуе 14 студэнцкіх і 4 аспіранцкія "ячэйкі грамадства". Нягледзячы на складаную сітуацыю з месцамі ў інтэрнатах БДУ (нагадаем, што на капрамонт закрыты інтэрнат № 7 ажно на 1200 чалавек), дырэкцыя Студгарадка заўсёды намагаецца засяліць маладую сям'ю разам, найперш тых, хто мае дзяцей. Памятаюць таксама пра тое, што сямейным студэнтам патрэбны пэўныя ўмовы пражывання, перадусім – цішыня і адасобленасць ад вясёлых суседзяў. Большасць студэнцкіх сем'яў кампактна месціцца ў інтэрнаце № 3, дзе пакоі блочнага тыпу і побач гай. Чаго яшчэ жадаць сямейнай моладзі? Хіба што пясочніцы для дзетак – такая просьба паступіла ў Студгарадок, які зараз імкнецца вырашыць пытанне з забудоўшчыкамі тэрыторыі.

Студгарадок спрабуе дапамагчы і тым сем'ям, дзе муж ці жонка – студэнт іншай навучальнай установы. У такім выпадку можа быць здзейснены абмен месцамі паміж інтэрнатамі двзвюх ВНУ. "Што можам, робім", – гэта крэда дырэктара Студгарадка Міхаіла Чарапеннікава.

### Здароўе і адпачынак

Сямейных студэнтаў у нас каля 250-ці. Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ кожнаму з іх гатова даць юрыдычную кансультацыю, аказаць матэрыяльную дапамогу, а таксама дазволіць бясплатнае наведванне басейнаў і трэнажорных залаў БДУ два разы на тыдзень. З 1 лютага 2008 г. для членаў прафсаюза дзейнічае зніжка 15 % на аздараўленне ў санаторыях "Белпрафкурорт" (па рашэнні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі). Акрамя таго, зараз прафкам дабіваецца, каб студэнцкія дзеці ад школьнага ўзросту і да 18-ці гадоў маглі атрымліваць бясплатныя пуцёўкі санаторнага тыпу (зараз такі прывілей маюць толькі дзеці супрацоўнікаў БДУ).

На Новы год быў зладжаны шэраг мерапрыемстваў па падтрымцы сямейных студэнтаў: паездка да Дзеда Мароза ў Белавежскую пушчу і паход у цырк, а для студэнцкіх дзетак з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі – акцыя "Дзед Мароз прыходзіць у хату". Да таго ж на дзяцей была выдаткавана матэрыяльная дапамога да трох базавых велічынь і ўручаны традыцыйныя навагоднія падарункі. Падчас леташняга святкавання Дня маці студэнцкі прафкам сумесна з Саюзам жанчын БДУ арганізаваў сустрэчу рэктара з мнагадзетнымі маці – студэнткамі і аспіранткамі універсітэта.

### Слова мамам

Вера Гярчынская заканчвае ФПМІ. Вучыцца падабаецца, але пасля заняткаў яна заўсёды спяшаецца – трэба забраць пяцігадовую Наталлю з садка. Часам даводзіцца разам з дачкой ісці на іспыты, але выкладчыкі ставяцца да гэтага з разуменнем. Вера з прыязнасцю прыгадвае паездкі, якія для яе маленькай сям'і арганізаваў універсітэт, дзякуе таксама прафкаму, які паспрыяў у пошуках адваката, калі на тое была патрэба.

У Вольгі Круцько былі цяжкасці з афармленнем дэкрэтнага адпачынку, частка якога прыпала на час вучобы, што падлягала аплаце. Зараз 25-гадовая дызайнер вучыць блізнят Мішу і Рому маляваць фарбамі, спадзяецца скончыць гуманітарны факультэт і пайсці працаваць – а там можна будзе і яшчэ дзетак завесці.

Алена Сушко вучыцца на III курсе ФФСН. Пасля нараджэння трэцяга дзіцяці яна атрымала ад студэнцкага прафкама грашовую дапамогу, бо сям'я патрапіла ў цяжкае матэрыяльнае становішча. А старэйшаму сыну так спадабалася на Новы год у Белавежскай пушчы, што ён дагэтуль просіцца з'ездзіць туды яшчэ раз. Маладая мама мае добрыя стасункі з дэканатам ("Заўсёды нагадаюць, што і калі") і ўдзячная за штогадовыя падарункі дзецям на Новы год. Пасля заканчэння вучобы Алена гатовая да папаўнення сям'і: "Вельмі люблю дзяцей. Самае цудоўнае, што чалавек можа зрабіць, – нарадзіць і выхаваць добрых дзетак".

**Падрыхтавала Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

ЮБІЛЕІ



***Ужо стала добрай традыцыяй напярэдадні цудоўнага свята Дня жанчын гутарыць з выбітнымі жанчынамі нашага універсітэта, якія сваёй няўрымслівай дзейнасцю і неардынарнасцю асобы славяць альма-матэр. Адной з іх з'яўляецца загадчыца кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта дацэнт Таццяна КАЗАКОВА, якой 5 сакавіка споўнілася 50 гадоў.***

***Яна з годнасцю ставіцца да свайго ўзросту і ўпэўнена: "Юбілей – гэта асэнсаванне таго, што чалавек прайшоў за час свайго жыцця, і вызначэнне перспектыў на будучыню".***

# ДАСЛЕДЧЫЦА СТАРАЖЫТНАСЦІ

**– Адкуль у Вас цікавасць менавіта да айчыннай літаратурнай спадчыны?**

– Любоў да слова і гісторыі мне прывілі бацькі. Мой тата, Пётр Сотчанка – заслужаны настаўнік рэспублікі, усё жыццё працаваў выкладчыкам гісторыі, і маці таксама была настаўніцай. Самой жа мне не шанцавала з настаўнікамі беларускай літаратуры ў школе. Я прагнула атрымаць лепшыя веды, бо тут яшчэ столькі нязведанага! Мая мара ажыццявілася, калі я паступіла на філфак БДУ. З першага курса я пачала займацца вывучэннем старажытнай рускай літаратуры, якую бліскуча выкладала Ларыса Кароткая. Менавіта яна накіравала мяне на распрацоўку складаных праблем старажытнабеларускай літаратурнай спадчыны.

**– Што робіцца сёння ў межах вашай кафедры?**

– Мы глыбока даследуем вытокі і ўплывы ў беларускай літаратуры XI–XIX ст., перакладае на сучасную мову творы з царкоўнаславянскай, старапольскай і іншых моваў. Шмат працуем у архівах Беларусі, Польшчы і Літвы. Таксама часта ладзім сустрэчы студэнтаў з вядомымі пісьменнікамі, супрацоўнікамі Акадэміі навук, праводзім літаратурныя вечарыны. У мінулым семестры адбылося мерапрыемства, прысвечанае 160-годдзю пісьменніцы Зосі Манькоўскай. З'ездзілі на яе радзіму ў вёску Бабоўня Капыльскага раёна, наладзілі ў Копылі навуковыя чытанні, сустрэліся з мясцовымі настаўнікамі. Падчас паездкі высветлілася, што жыхары ведаюць шмат паданняў і гісторый пра вядомую зямлячку. Школьнікі паабяцалі іх запісаць і перадаць нам. У нас цудоўны калектыў, і мы даследуем старажытнасць, каб лепей зразумець сучаснасць.

**– Якія маеце ўласныя навуковыя інтарэсы?**

– Я займаюся літаратурнай спадчынай выдатнага пісьменніка і царкоўнага дзеяча XV ст. Грыгорыя Цамблака, праблемамі традыцыі і наватарства ў яго творчасці. Таксама мяне захапляе гісторыя роду Радзівілаў. Пакуль што не ўведзены ў нашу беларускую літаратуру Дыярыуш (дзённік) Тэафілі Мураўскай – дачкі знакамітага гетмана ВКЛ Міхала Радзівіла Рыбанькі. Гэты дзённік знайшоў у архіве Віленскага універсітэта польскі навуковец Богдан Рок. Ім я зараз і займаюся.

**– Чым, на Ваш погляд, адметныя беларускія жанчыны?**

– Я ўпэўнена, што генетычны код нашай нацыі найлепей выявіўся ў постаці Ефрасінні Полацкай, асветніцы, жанчыны-арганізатара, якая насуперак візантыйскай традыцыі пакутніцтва прапагандавала ідэал дзейснай асобы. Нам трэба працягваць яе справу – упрыгожваць духоўную скарбніцу нашага народа новымі адкрыццямі і здзяйсненнямі.

**Гутарыла Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# СУПЕРМЭНАМ ЗВАЦЦА...

***На першы погляд можа здацца, што герояў зараз ужо няма. Але гэта не так, бо сапраўдныя мужчыны – гэта звычайнага выгляду хлопцы, якія знаходзяцца побач. Выдаць іх можа хіба што ўпэўнены позірк і добрае сэрца.***

Раскрыцца, паказаць уласныя магчымасці такія маладыя людзі маглі 27 лютага на конкурсе Студгарадка "Супермэн–2008", які выявіў самага мужнага, прыгожага, вясёлага і артыстычнага юнака сярод жыхароў усіх інтэрнатаў нашага універсітэта.

За галоўны тытул змагаліся 8 прэтэндэнтаў, якія спаборнічалі ў трох конкурсных частках: "Дэфіле", "Вобраз" і "Кліп". Вылучыць кагосьці з іх было вельмі складана, бо ўсе ўдзельнікі вельмі добра падрыхтаваліся: шмат цікавых вобразаў, прыгожых прамоў, цудоўных песень, спрытных танцаў – сапраўдная творчая фіерыя! Многія дзяўчаты, мабыць, задумаліся: "І навошта тыя завоблачныя мары пра прынца на белым лімузіне?!"



*Супермэн–2008 Дзмітрый Буцэр.*

Урэшце, лаўры пераможцы дасталіся студэнту факультэта журналістыкі і жыхару "дзесяткі" Дзмітрыю Буцеру, які атрымаў адпаведны дыплом і тэлевізар "Гарызонт" у якасці прыза. Званне "Містэр Элегантнасць" (другое месца) і магчымасць рамантычна павячэраць заваяваў Алег Лабачоў з інтэрната № 4. Ну а тытул "Містэр Крэатыў" далі Сяргею Жуку з інтэрната № 2. Яшчэ ўсе прызёры атрымалі абанемент са зніжкай 50 % пры наведванні салярыя (яго можна падарыць сваёй абранніцы!). Астатнія ўдзельнікі конкурсу таксама не засталіся па-за ўвагай.

Шоу ўдалося. Шкада толькі, што ладзіцца яно адзін раз на год, і сваіх куміраў дзяўчынам трэба знаходзіць самастойна. Жыццё – гэта пошук шчасця, не прапусціце яго, будзьце ўважлівымі!

**Юлія ХМЯЛЕЎСКАЯ**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

Ужо традыцыйнымі сталі вандроўкі для студэнтаў, што жывуць у інтэрнатах, па розных кутках любімай Беларусі і знаёмства з яе гістарычнай спадчынай. На гэты раз жадаючыя, а іх было вельмі шмат, здолелі 1 сакавіка наведаць гарады Будслаў, Мядзель, Паставы, Лучай, палюбавацца прыгажосцю возера Нарач, падзівіцца на заморскіх птушак – страусаў.

***

Пазнаёміцца з гісторыяй надзвычайных сітуацый і гісторыяй Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь змогуць студэнты 18 сакавіка падчас экскурсіі ў Музей агню.

***

19 сакавіка адбудзецца бадай што самае папулярнае шоу Студэнцкага гарадка "Міс Вясна–2008" . На званне "самай-самай" будуць прэтэндаваць 8 удзельніц з інтэрнатаў. Ужо зараз падрыхтоўка да конкурсу ідзе поўным ходам. Галоўны прыз конкурсу – вандроўка ў Кіеў. Чакаем вас а 19 гадзіне ў актавай зале Ліцэя БДУ.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

7 сакавіка 2008 года
Падпісана да друку 05.03.2008 г.
Зак. 208. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by